

Грамадзянскі ФОРУМ

The bulletin is made up on the equipment given by US Information Agency (USIA) №15 (21) 1 – 15 августа, 2000 года

29 ліпеня ў Мінску прайшоў Усебеларускі з'езд, на якім быў прыняты ўсяго адзін дакумент – Акт Незалежнасці.



Гэта свайго роду дэкларацыя суверэнітэту краіны як галоўнай умовы існавання ды развіцця чалавека і ўсяго грамадства Беларусі. Таму суверэнітэтам нельга гандляваць ні ў якіх мэтах. Паказальна, што акт прыняты з'ездам, які правялі не апазіцыйныя партыі, тым больш не ўлада, а прадстаўнікі, так бы мовіць, незалежнай грамадскасці. Што разглядаецца як прапанова мець нарэшце і ў нас хоць адну агульную каштоўнасць .

Улады вуснамі міністэрства юстыцыі яшчэ напярэдадні абвесцілі з'езд нічога не вырашаючым сходам грамадзянаў, усе рашэнні якога не будуць мець ніякай юрыдычнай сілы. Паводле вызначанага курсу дзейнічалі і дзяржаўныя СМІ. Прыкладам, БТ такой падзеі не заўважыла ўвогуле, там усе наяўныя творчыя сілы аказаліся кінутымі на жніво і рэкламу чарговага прэзідэнцкага падарунка беларускаму народу – лядовага палаца ў Брэсце. Затое тры асноўныя каналы расійскага тэлебачання чамусьці брэсцкім лёдам не зацікавіліся і асвятлілі вынікі Усебеларускага з'езда. Прычым асвятлілі даволі шырока. НТВ дык зрабіла нават два асобныя рэпартажы, яўна скарэктаваўшы ў другім танальнасць рэпартажу на карысць з'езда. Праўда, расіяне зноў не здолелі адарвацца ад сваіх стэрэатыпаў. Паказваючы бел-чырвона-белы сцяг, яны абавязкова кажуць пра апазіцыю і нацыяналістаў, абавязкова шукаюць праявы антырускасці і не супакойваюцца нават, калі іх не знаходзяць. Удзельнікі з'езда ў падачы расійскіх журналістаў былі тымі, хто "супраць саюза з Расіяй".

Між тым, з'езд задумваўся і яго ўдалося правесці менавіта як акт волевыяўлення прадстаўнікоў народа, як дэманстрацыя прагі беларусаў быць не супраць кагосьці, а за Беларусь. Моц гэтай падзеі ў тым, што, не зважаючы на сімпатыі ці антыпатыі да пэўных палітыкаў і палітычных канцэпцыяў, акрэслены нейкі агульны для ўсіх набор каштоўнасцяў, што складаюць падмурак беларускага светапогляду, усёй будоўлі пад назвай Беларусь. Тое, што асноўным каменем гэтага падмурка з'яўляецца НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ, не ёсць вынаходніцтва з'езда, прызналі ягоныя ўдзельнікі. У гэтым сэнсе яны выстройвалі гістарычны ланцужок ад 27 ліпеня 1990 года, калі была прынятая дэкларацыя аб суверэнітэце Беларусі, праз супярэчлівую гісторыю стагоддзя да 25 сакавіка 1918 г.

З гэтага дня абвяшчэння БНР і далей у часы ВКЛ, у глыбіню вякоў, калі на тэрыторыі сучаснай Беларусі ўзніклі першыя дзяржаўныя ўтварэнні. Дзякуй Богу, з'езд не стаў гістарычнай канферэнцыяй ці сходам ветэранаў Аршанскай ды іншых слаўных перамогаў над знешнімі ворагамі. Спыніліся на тым, што пакуль народ Беларусі змагаўся за незалежнасць, ён заставаўся народам, што незалежнасць – здабытак не толькі сённяшніх пакаленняў беларусаў, але таксама і мінулых, а галоўнае, будучых, і таму нікому не дадзена распараджацца гэтай каштоўнасцю як таварам. Шмат і грунтоўна казалі пра сённяшні цяжкі для беларускасці час, пра тое, што ўлады не дапамагаюць ратаваць мову, што на ўскрайку прагрэсу апынулася эканоміка, што маючыя ўладу палітыкі, каб захавацца, гатовыя прынесці ў закланне суверэнітэт краіны. Адсюль лагічным выглядала рашэнне з'езда заявіць, што ніякі дзяржаўны орган нават праз рэферэндум не ў праве ні з кім заключаць саюзы, якія б пазбавілі Беларусь яе незалежнасці.

Гэты прынцып быў абвешчаны ад імя прадстаўнікоў беларускага народа. Але хто ж яны такія, гэтыя прадстаўнікі, што з'ехаліся ў Мінск у мінулую суботу і якіх улады ўжо паспяшылі абвесціць самазванцамі (гэтак кажуць прадстаўнікі ўлады, стрыжань якой з ліпеня мінулага года ў большасці свету лічыцца нелегітымным)? Вось крыху статыстыкі. Усяго на з'езд былі вылучаныя ад працоўных калектываў, сходаў жыхароў, палітычных партыяў і грамадскіх арганізацыяў 1.452 дэлегаты, з іх у з'ездзе ўдзел прынялі 1.350.(Заўважу пры гэтым, што аргкамітэт не ствараў перашкодаў да вылучэння, аднак кваціраваў колькасць прадстаўнікоў. І яшчэ важны момант – у працэсе падрыхтоўкі з'езда ўлады хутчэй перашкаджалі, чым дапамагалі, але варта адзначыць, што перашкодаў непасрэдна ў мінулую суботу не чынілася).

Працяг на стар. 2

Працяг. Пачатак на стар. 1

З усіх дэлегатаў ад Мінска на з'езд прыбыло 568 і ад кожнай вобласці – ад 104 да 166 пасланцоў. Мандатная камісія з'езда абвесціла, што былі прадстаўленыя 102 з 117 раёнаў Беларусі (да ведама, у лукашэнкаўскім Нацыянальным сходзе не прадстаўленыя больш за палову выбарчых акругаў, аднак прадстаўніцтва ад раёнаў адпаведнае з'езду).

Інфармацыя пра тое, як прадстаўленыя палітычныя партыі на з'ездзе, не гучала, і, здаецца, спецыяльна такі ўлік не вёўся. Партыі ўвогуле не дамінавалі на з'ездзе, і нават партыйныя лідэры на ім не выступалі. Кіравалі з'ездам і натхнялі прысутных з прэзідыума вядомыя дзеячы культуры і навукі – паэт Генадзь Бураўкін, паэт Ніл Гілевіч, акадэмік Радзім Гарэцкі, вядомы гісторык Анатоль Грыцкевіч , паэт Рыгор Барадулін. Большасць з іх выступіла з дакладамі, а таксама з прамовамі звярнуліся старшыня БХК Таццяна Працька, экс-прэм'ер Міхаіл Чыгір, кіраўнік "Гарадзенскай ініцыятывы" Сямён Домаш, намеснік старшыні "Грамады" Аляксей Кароль. Таксама былі зачытаныя прывітанні да з'езда ад Васіля Быкава, Сямёна Шарэцкага, Івонкі Сурвілы і асобнае пасланне Зянона Пазьняка. Усе гэтыя пасланні дэлегаты ўспрымалі як знакавыя і адказвалі на іх ўставаннем ды авацыямі. Гэтак жа было сустрэтае і адмысловае пасланне чэшскага прэзідэнта Вацлава Гавела, які вітаў дэлегатаў як пасланцоў народа, што адстойвае дэмакратычныя каштоўнасці. На з'ездзе, дарэчы, прысутнічалі шмат хто з замежных дыпламатаў і нават кіраўнікоў місіяў – амбасадар Францыі Бернар Фасье, часовы паверанý Чэхіі Алеш Фойцік, пасол Польшчы Марыюш Машкевіч, амбасадар Украіны Анатоль Дронь і іншыя дыпламаты. Гэта безумоўна сведчыць пра тое, што замежнікі не абмяжоўваюць сябе зваротамі толькі да палітыкаў, а хочуць пачуць і голас народа. Магчыма, яны ідэнтыфікавалі прамовы прадстаўнікоў нацыянальна свядомай эліты Беларусі з голасам народа і нават зрабілі выснову, што большасць жыхароў гэтай краіны мысляць і дзейнічаюць па-еўрапейску і хочуць жыць у сяброўстве з усімі суседзямі па еўрапейскім доме. Але галоўнае, каб паразумеліся паміж сабой мы, беларусы. Усебеларускі з'езд пры ўсёй умоўнасці ягонай усебеларускасці такі шанец дае. Выкарыстаем?

АКТ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ

Мы, дэлегаты Усебеларускага З'езда, паўнамоцныя прадстаўнікі народа Беларусі,

— усведамляючы адказнасць за будучыню краіны;

— напамінаючы, што Рэспубліка Беларусь з'яўляецца дзяржавай-заснавальніцай Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў;

— грунтуючыся на прынцыпах і нормах міжнароднага і нацыянальнага права,

ЗАЯЎЛЯЕМ:

Беларускі народ мае тысячагадовую гісторыю сваёй дзяржаўнасці: ад Полацкага княства, Вялікага Княства Літоўскага, Беларускай Народнай Рэспублікі да сучаснай Рэспублікі Беларусь. Прынятая Вярхоўным Саветам 27 ліпеня 1990 года Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце сцвярджае яго дзеля галоўнай мэты – свабоднага развіцця і дабрабыту, годнага жыцця кожнага грамадзяніна Беларусі. Яна абвяшчае незалежнасць краіны ў вонкавых дачыненнях, вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады, дзеючай на падставе правамоцных законаў. Любыя дзеянні супраць суверэнітэту Беларусі і нацыянальнай дзяржаўнасці недапушчальныя і павінны карацца як найвялікшае злачынства.

Дзяржаўны суверэнітэт быў замацаваны ў Канстытуцыі, прынятай 15 сакавіка 1994 года. Паводле яе Беларусь увайшла ў свет як нейтральная, мірная і бяз'ядзерная дзяржава.

Незалежнасць Беларусі з'яўляецца набыткам не толькі сённяшняга пакалення, але і нашых продкаў і належыць нашчадкам. Суверэнітэт краіны не можа быць абмежаваны або скасаваны праз рашэнні дзяржаўных асобаў і органаў, нават праз рэферэндум.

Сёння незалежнасць Беларусі знаходзіцца пад пагрозай. Рэальнай небяспекай стаў дагавор аб стварэнні так званай саюзнай дзяржавы з Расіяй, падпісаны 8 снежня 1999 года прадстаўнікамі беларускіх уладаў, чыя легітымнасць не прызнаецца ў большасці краінаў свету. Мы – за добрыя, раўнапраўныя і ўзаемавыгадныя адносіны з усімі краінамі свету, і асабліва з суседзямі: Расіяй, Украінай, Польшчай, Літвой, Латвіяй. Але мы не жадаем станавіцца рэгіёнам іншай дзяржавы. Мы не дазволім ліквідаваць нашу незалежнасць і абмяжоўваць наш суверэнітэт, знішчыць нашу краіну.

Незалежнасць – гэта натуральнае права ўсяго народа, кожнага грамадзяніна. Толькі яна і толькі дзяржаўны суверэнітэт адкрываюць шлях нашай краіне ў еўрапейскую і міжнародную дэмакратычную супольнасць.

Мы, дэлегаты Усебеларускага З'езда,

СВЕДЧЫМ

Богам і гісторыяй дадзенае нашаму народу права мець сваю незалежную дзяржаву з яе адвечнымі сімваламі – бел-чырвона-белым сцягам і гербам "Пагоня";

АБВЯШЧАЕМ

дзяржаўны суверэнітэт неад'емнай каштоўнасцю беларускага народа;

ПРЫЗНАЁМ

не маючымі законнай сілы любыя пагадненні і рашэнні, скіраваныя на скасаванне альбо абмежаванне суверэнітэту Беларусі;

ЗАКЛІКАЕМ

усіх грамадзянаў Беларусі і ўсіх суайчыннікаў за мяжой згуртавацца вакол ідэяў Акта Незалежнасці Беларусі, бараніць незалежнасць Айчыны;

парламенты і ўрады дэмакратычных дзяржаваў, міжнародныя арганізацыі і сусветную грамадскасць забяспечыць гарантыі суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Жыве Беларусь!

Прынята Усебеларускім З'ездам 29 ліпеня 2000 года ў Мінску.

Наша Свабода Новости

✍ **За правядзенне 27 ліпеня ў Дзень Незалежнасці несанкцыяванага антыфашыстоўскага пікета 31 ліпеня на сем сутак быў асуджаны сябра гомельскай арганізацыі БСДП(НГ) Ігар Раманаў.** Ягоная сяброўка Кацярына Гаравая атрымала ад суддзі Цэнтральнага суда г.Гомеля пяць сутак. Падчас працэсу падсудныя засведчылі, што свядома пайшлі на арганізацыю і правядзенне несанкцыяванага пікета на прыступках будынка аблвыканкама, бо гарадскія ўлады, маўляў, усё роўна не даюць дазвол на правядзенне пікетаў у цэнтры горада. Ну а сам пікет заключаўся ў плакатах "З днём Незалежнасці!" і "Не — фашызму на Беларусі!". Арганізатары тлумачылі з'яўленне апошняга дзейнасцю на Беларусі прафашысцкіх груповак кшталту РНЕ.

✍ **Па факце смерці былога мэра Санкт-Пецярбурга Анатоля Сабчака ўзбуджаная крымінальная справа.** Пра гэта паведаміў расійскі журналіст Андрэй Каравулаў у эфіры радыёстанцыі "Эха Масквы". Па ягоных словах, крымінальная справа ўзбуджаная па прыкметах злачынства, прадугледжанага першай часткай 105-га артыкула "Забойства з абцяжарваючымі абставінамі", на падставе вынікаў ускрыцця цела А.Сабчака. Як вядома, 20 лютага вядомы палітычны дзеяч 80-90-х гадоў паехаў у Калінінград агітаваць за свайго былога студэнта Уладзіміра Пуціна і там уначы сканаў – нібыта ад інфаркту.

✍ **"Дажынкі" сёлета пройдуць 22-23 верасня ў Шклове.** 2 жніўня на паседжанні аргкамітэта "Дажынак" у Савеце міністраў пад старшынствам віцэ-прэм'ера Аляксандра Папкова менавіта гэтыя дні названыя ў якасці прыкладнай даты правядзення свята ўраджаю. Нагадаем, што летась шырока разрэкламаваныя "Дажынкі" так і не адбыліся.

✍ **Адзенне для алімпійскай зборнай Беларусі вырабляецца на беларуска-італьянскім прадпрыемстве "Дынама–Праграм-Гродна".** Як паведаміла начальнік аддзела эканомікі прадпрыемства Наталля Самойлік, 320 спартыўных касцюмаў будуць перададзеныя алімпійцам да канца першай дэкады жніўня. Па яе словах, складанасць заказу ў тым, што кожны выраб уключае дзесяць працаёмкіх вышывак з аддзелкай. Узор формы быў распрацаваны спецыялістамі італьянскай кампаніі "Уніформ-Праграм".

✍ **Старшыня рэспубліканскага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Тамара Чобатава запатрабавала ад кіраўніка Савета міністраў пагасіць запазычанасць перад настаўнікамі.** У лісце, накіраваным на імя Уладзіміра Ярмошына, гаворыцца, што рашэнне Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях разлічыцца з настаўнікамі да 20 ліпеня не выкананае. Між тым, дзяржава завінавацілася настаўнікам (па стане на 21 ліпеня) 3 мільярды 512 мільёнаў рублёў: гэта 1 мільярд 52 мільёны чэрвеньскай зарплаты і 2 мільярды 496,3 мільёна адпускных за ліпень.

Нягледзячы на летнія канікулы, многія настаўнікі вымушаныя працаваць – бо жыць неяк трэба. А грошай на адпачынак і аздараўленне няма. У вачах настаўніцтва дзяржава канчаткова страчвае свой сацыяльны статус.

"Наблюдателей здесь не должно быть"



23 августа Минский горсуд оставил обвинительный приговор Ленинского суда в отношении депутата Верховного Совета 13-го созыва Андрея Климова в силе — шесть лет лишения свободы. Это решение может отрицательно сказаться на отношении мирового сообщества к осенним выборам, поскольку одним из четырех условий для признания выборов демократичными является освобождение всех политзаключенных. Этот факт, а также последние заявления Александра Лукашенко, непосредственно связанные с выборами в палату представителей, комментирует кандидат в депутаты Михаил Чигирь.

— 23 августа Минский городской суд оставил в силе приговор Андрею Климову, признанному международными правозащитными организациями, как и Вы, узником совести. Как Вы прокомментируете этот факт?

— Что комментировать? Депутаты вселились в дом, построенный Климовым, а самого Климова не защитили, хотя должны были защищать. Я думаю, что этот приговор вынесен по указанию сверху. Такое решение Мингорсуда было прогнозируемо. До суда Климов очень долго находился за решеткой. Чтобы както оправдать его длительное заключение, суд был запрограммирован на подобный приговор. Если бы ситуация в стране была иной, то суд ведь мог вынести *любое* решение.

— 23 августа на совещании с руководством Александр Лукашенко сделал заявление: "Идеология не подлежит приватизации. Телевидение останется монополией государства". Как Вы расцениваете подобные высказывания?

— Лукашенко никогда не выпустит из-под своего контроля средства массовой информации, потому что в этом случае его политическая жизнь будет весьма недолговечной. Телевидение —то оружие, которым Лукашенко не даст воспользоваться никому. Ведь Белорусское телевидение содержит не Лукашенко, а налогоплательщик. В любом цивилизованном государстве как Лукашенко, так и оппозиция имели бы к нему равный доступ. Но Лукашенко не пойдет на демонополизацию телевидения, потому что он боится потерять власть.

— Международное сообщество поставило перед белорусскими властями четыре требования: гарантированный доступ оппозиции к государственным СМИ, прекращение политических репрессий, демократизация Избирательного кодекса, расширение полномочий парламента. На Ваш взгляд, эти условия выполнены или проигнорированы?

— Эти требования полностью не выполнены. До меня дошла информация, будто я как кандидат в депутаты якобы поддерживаю приезд международных наблюдателей на осенние выборы. Я приезд наблюдателей не поддерживаю. Условия не выполнены, наблюдатели здесь не должны быть, а значит, эти выборы не должны быть признаны. Несмотря на то, что в них участвуют Чигирь, Статкевич и другие.

По материалам сайта «Наша Свобода»

Цырк на ровары: міліцыянт у дазоры

Міліцыянты трох раёнаў беларускай сталіцы пачалі асвойваць новы сродак руху. Гэтым разам сілавікоў ніжэйшага звяна пасадзілі на ровары.

Ідэя перасадзіць частку міліцыянтаў на ровары нарадзілася выпадкова. Мінскі велазавод, не маючы грошай, каб заплаціць падатак на бяспеку, прапанаваў упраўленню ўнутраных справаў Мінгарвыканкаму бартэр гатовай прадукцыяй – прыгадаўшы, што ў 30-я гады польскі корпус аховы памежжа выкарыстоўваў аналагічны сродак перасоўвання. Да ўсяго ж, у якасці галоўнага аргумента быў названы асноўны фактар нечаканасці – бясшумнасць. Прынамсі, кіраўнікоў аддзелаў унутраных справаў Заводскага, Цэнтральнага ды Фрунзенскага раёнаў аргумент уразіў.

Цяпер у эксперыменце ўдзельнічаюць 10 ровараў "Бусел" і 20 міліцыянтаў, якіх адбіралі перш за ўсё паводле камплекцыі. Усе яны кінутыя на патруляванне вадасховішчаў ды лесапаркавых зонаў.

Але ўжо першыя дні выпрабаванняў акрэслілі шэраг праблемаў. Пачалося з таго, што два ровары амаль адразу ж былі скрадзеныя: зручнасць патрулявання скончвалася, калі трэба было на нейкі час дзесьці прыпаркавацца. Па-другое, адразу ж паўстала пытанне наконт адмысловай формы: непрыстасаваныя да велапрабегаў шырокія калашыны ўвесь час трапляюць у ланцуг. А адзін з міліцыянтаў, напрыклад, наогул паскардзіўся, што з багажніка ўвесь час вывальваецца тэчка, і таму, прыціскаючы яе пад пахаю, прыходзіцца руляваць па калдобінах аднойрукою. Да таго ж, экіпіроўка – а гэта пісталет, газавы балончык, дадатковая абойма, гумавы дручок, наручнікі, рацыя і ліхтар – замінае быць дастаткова мабільным.

Таксама ўзнікае пытанне, як сябе паводзіць у выпадку затрымкі злачынца: ці прывязваць таго да багажніка, ці пакідаць ровар да пары без нагляду ў патаемным месцы.

Але энтузіязм у кіраўніцтва аддзелаў застаецца: днямі з'явіліся прапановы пасадзіць на ровары і ўчастковых інспектараў. Вось як на гэта адрэагаваў інспектар з Фрунзенскага раёна, які не пажадаў назваць сябе, баючыся магчымых санкцыяў: "Словам, я так не супраць. Але я не ведаю, калі нас, участковых, перасадзяць на ровары, дык куды я ад іх дзенуся? На паверх жа я яго не пацягну, а калі пакіну ўнізе – сцягнуць ці колы папракалваюць. Я не ведаю. Ну ўлетку на роварах, а зімой што – на лыжах? Я наогул не супраць, але як, што – не ведаю".

Прыгадваецца яшчэ адзін эксперымент, некалькі гадоў таму распачаты Мінскім ГУУС. Намеры пасадзіць конна значную частку міліцыянтаў скончыліся сціплымі паказчыкамі: у міліцэйскай стайні толькі тры скакуны. Пракарміць большую частку жывёлаў сталічная міліцыя проста не здольная.

Затое некаторыя іншыя сродкі руху, якія выкарыстоўваюць беларускія праваахоўнікі, не маюць аналагаў у свеце. Няма звестак, каб недзе яшчэ ў якасці адмысловага гарадскога транспарту былі задзейнічаныя сельскагаспадарчыя трактары. Практычна ўвесь парк гэтак званых "эвакуатараў" базуецца на прадукцыі МТЗ. Нягледзячы на тое, што Канстытуцыйны суд напачатку года рэкамендаваў прыпыніць дзейнасць эвакуацыйных групаў, колькасць трактарных брыгадаў не зменшылася, а гэтак званыя "штрафпляцоўкі" па-ранейшаму перапоўненыя.

Затое некалі папулярныя ў міліцэйскіх колах матацыклы засталіся толькі ў прэзідэнцкім эскорце. А вось верталёты дарожнага патрулявання, здаецца, зніклі наогул.

Па матэрыялах сайта «Наша Свабода»



На такім ровары замест жанчыны мусіць быць міліцыянт

Не успели демократические партии провести Всебелорусский съезд и принять единогласно Акт о независимости, как Александр Лукашенко не замедлил объявить о созыве Съезда Советов. Около полутора тысяч депутатов всех уровней, включая нелегитимных палаточников, соберутся 29 сентября, чтобы принять альтернативные решения Всебелорусскому съезду, который, по странному стечению обстоятельств, тоже прошел 29 числа.

Чтобы упредить желание оппозиционеров собраться еще раз накануне президентских выборов в будущем году, А.Лукашенко намерен весной провести Второе Всебелорусское Собрание.


Если демократические партии собрались, чтобы бороться за независимость, то депутаты будут решать вопросы наращивания экспорта, строительства жилья и развития агропромышленного комплекса. Это так сказать первоочередные стратегические задачи. По ходу дела собравшиеся конкретизируют вопросы структурной трансформации экономики, реформирования отношений собственности, создания действенной конкуренции товаропроизводителей. Не понятно только, если все эти проблемы можно решить одним съездом депутатов, то почему такие форумы не проводятся раз в неделю?

Вертикаль уходит за ширму Советов

Стоит ли напоминать, что проведение съезда продиктовано необходимостью всенародной поддержки широкой общественной инициативы населения, повышения социально-политической активности граждан, реализации идей социального правового государства и решения важных государственных проблем в духе гражданского согласия. Ни больше, ни меньше.

Очевидно, что Александр Лукашенко напуган инициативой творческой элиты Беларуси, сумевшей собрать под знамена Всебелорусского съезда все оппозиционные силы. Но он все еще не понимает, что людей объединяет угроза потери независимости, а не проблема развития села.

По материалам сайта «Наша Свабода»



Антисемит — это злобное животное в рубашке

Когда государство проявляет толерантность к неофашистам, от них приходится терпеть гражданам.

Месяц назад на перроне станции метро “Академия наук” я увидела группу молодых людей в черной одежде со свастиками на рукавах. Люди обходили эту пугающую компанию, и только одна пожилая женщина приблизилась к ним и, указывая на свастику, закричала: “Фашисты! У нас, в Беларуси, в центре города!” — “Идите, идите, вы ничего не понимаете, —отмахнулись они от женщины, — это святой символ!”

Чернорубашечников прибывало, было видно, что они выбрали эту станцию для сбора. Я подошла к парню, которого явно слушались остальные, и спросила, не подходил ли к их отряду, который уже долго находится на станции, кто-нибудь из дежурных сотрудников милиции? К нам в правозащитный центр много раз обращались люди, которых привлекали к административной ответственности за несанкционированные собрания и за деятельность в незарегистрированной организации, а тут на перроне — явное нарушение: несанкционированное собрание у всех на глазах в форме с незарегистрированной символикой. Да еще какой! Оказалось, что дежурный милиционер подошел и попросил поскорее уехать – и на этом все! Только в мое присутствие чернорубашечники находились на перроне около получаса. Они рассказали, что едут на “разборку” с милицией – накануне шесть членов организации были задержаны и на них заведено уголовное дело. Как разбирались – не знаю.

Через неделю после той встречи в метро к нам в Правозащитный центр “Весна” обратилась семья — Екатерина и Василий Стальмаховичи, которым вместе с годовалой дочуркой приходится на себе испытывать идеологию фашиствующих молодчиков. Из-за национальности мужа. Все началось телефонным звонком к мужу, когда молодые жили у родителей Кати. Спрашивают: “Вася?” — “Да. А кто звонит?” — “Узнаешь, еврюга! Встретимся”.

Недели через две, когда Катя лежала в больнице на сохранении, а Вася возвращался от нее, в подъезд следом за ним вошли двое высоких парней и начали его бить. Васе удалось вырваться. Дома он обнаружил неглубокую ножевую рану — то ли хотели порезать, то ли попугать. В тот же вечер ему позвонили и с издевкой поинтересовались, как себя чувствует.

Звонки стали частыми. И каждый раз те же самые слова и угрозы. Вскоре Катя, Вася и родившаяся дочурка переехали в собственную квартиру. Неизвестные продолжали звонить Катиным родителям, хамили по телефону. Потом звонки прекратились, и несколько месяцев было спокойно. Но оказалось, что подонки не собирались оставлять в покое эту семью.

Вася: Катя лежала с дочкой в больнице. Я возвращался с работы и в почтовом ящике, забирая почту, обнаружил лист, на котором было написано: “Вонючие жиды, убирайтесь в свой Вонючий Израиль!” Потом мне позвонили: “Ну, что, — говорят, — спрятался? Увидимся”.

Катя: Продолжается это давно. Если бы это было связано с какими-то личными делами, за это время можно было бы понять. Вася работает с моим отцом – он никому не должен. Много раз мы вспоминали все жизненные ситуации, думали, кому могли перейти дорогу. Нет такого. Ничего не требуют, просто угрожают. Я никогда не слышала, что у нас могут так преследовать. Я всегда говорила, что наш Минск – самый спокойный город.

Расстаться с последними иллюзиями семью Стальмаховичей заставила беда, случившаяся с ними в июне этого года. Под вечер Вася и Катя с дочкой вышли прогуляться. На пустыре за домом к Васе подошли трое мужчин, лет этак тридцати, в черных рубашках с закатанными рукавами, здоровые, бритые, и начали бить. Катя с коляской шла впереди, сразу ничего не поняла, единственное, что хорошо помнит – Вася закричал: “Убегай!” Она схватила дочку на руки и побежала к дому. Ее догнал чернорубашечник и ударил в спину. Женщина упала на ребенка, девочка сильно ударилась головой.

Вася: У одного из них брови были белые, как вата, и дикие глаза. Второй был какой-то ненормальный; когда меня бил, у него аж слюни текли. Один держал, а второй бил с дикой яростью. Дальше я помню, что прибежал мой сосед, плачет Катя, Лиза захлебывается в слезах – ей всего был год и месяц.

В милицию они тогда не пошли: кричал ребенок, вызвали “скорую” и поехали в больницу. Ребенку сделали рентген. Сказали, что очень сильный ушиб, и если тошнить не будет – значит не сотрясение. Теперь девочка всего пугается, ни к кому не идет. Боясь повторения, ребенка отвезли к Васиной маме. “Когда мы были вдвоем – это не было так ужасно, мы все же взрослые, но когда появился ребенок и появилась ответственность за него – стало страшно”, – говорит Катя.


Но преследование не закончилось. 6 июля Вася, возвращаясь домой, увидел, что стенку и дверь квартиры измазали фашисты. Он обратился к участковому: “Что делать? Звонят, бросают в ящик листки, теперь дверь”. Участковый ответил: “Что, я лягу у твоей двери?”, но посмотреть фашистскую роспись сходил. И дал понять, что у него и без этого много работы: “Знаешь, у меня лежит целая папка заявлений о порче имущества”.

Теперь проблема семьи: к кому обращаться за помощью? “Мы не знаем, как защитить себя и свою дочь, — говорит Катя. — Уезжать мы не хотим, мы здесь родились, учились, у нас хорошая работа. Что делать?”

В принципе, известно, что делать – требовать защиты от государства. Это чернорубашечники должны бы бояться надевать свои рубашки, свастики, выходить в них на люди, собираться стаями на перронах. Бояться – быть злыми животными. Они не боятся – им дозволено. Кому-то это выгодно или приятно. В такой ситуации в “спокойной Беларуси” не только эта семья, но множество людей чувствуют себя незащищенными. Пока власть потворствует пятой колонне, борцам за “славянский союз”, ничего не изменится. Значит, все дело во власть имущих. Как защититься от них?

По материалам сайта «Наша Свабода»

Почти год прошел после саммита ОБСЕ в Стамбуле, в котором принимал участие и руководитель Беларуси Александр Лукашенко. С тех пор, в каких-либо личных контактах с лидерами западных, соседних с Беларусью стран, он замечен не был. Разве что с коллегами по СНГ. Причина такого положения известна – сохранение в отношении руководства Беларуси политики ограниченных и выборочных контактов. Пока демократические выборы не пройдут, которые признает мировое сообщество.



И вот новый, с 6 по 8 сентября представительный форум — "саммит тысячелетия" в Нью-Йорке, в здании штаб-квартиры ООН. А по пути А. Лукашенко навестит Фиделя Кастро в Гаване, у которого, надо полагать, подпитается пассионарности в отношении США и других грабителей "третьего мира". Уже известно, что на вторую половину 6 сентября запланировано выступление в ООН Александра Лукашенко, который попытается донести до слушателей свое видение на происходящие в мире процессы. Правда, как обещают организаторы, форум будет проходить "круглыми столами" без участия прессы. И запись выступающих производиться не будет. Видимо, это и есть для политиков главное условие, при котором возможна свободная дискуссия.

Конечно, беседы за "круглым столом" отнюдь не исключают возможностей проведения двусторонних бесед. И такие будут в Нью-Йорке. В частности, уже объявлено, что там А. Лукашенко встретится с В. Путиным. Очевидно есть проблемы, которые им необходимо обсудить не только, к примеру в Ялте, но и в Нью-Йорке. Что касается возможных некоторых других встреч, то, как говорят мидовские чиновники, обычно о них договариваются уже в ходе такого рода мероприятий. Но уже сегодня известно, что никаких двусторонних встреч А. Лукашенко с лидерами западных и восточноевропейских стран не запланировано.

Кстати, о восточноевропейских странах. Как сообщил МИД Беларуси, на недавнем совещании стран Восточно-европейской региональной группы, в которую входит, оказывается, и Беларусь, было принято важное решение. До сих пор мало кому известная структура решила выдвинуть кандидатуру Беларуси в число вице- председателей 55-й сессии Генеральной Ассамблеи ООН, в рамках которой и пройдет саммит. Данное официальное сообщение нуждается в уточнении. Как удалось выяснить, кроме Беларуси, фигурировала еще одна кандидатура, попросившая самоотвод, который был принят. А по поводу оставшегося кандидата просто никто против не выступил и с молчаливого согласия присутствовавших Беларусь стала этим кандидатом. Как правило, на сессиях ООН предложенные кандидатуры утверждаются. Так что есть вероятность того, что представитель Беларуси Сергей Линг будет этак месяца три заседать в качестве одного из вице-председателей 55-й сессии ООН. Опыта и умения "сидеть" ему не занимать. А что касается другого опыта, который приобрел фаворит А. Лукашенко посол в США Валерий Цепкало, то после саммита его опыт может быть востребован в других столицах мира. Глава МИД Беларуси намерен и впредь эффективно производить ротацию засидевшихся за рубежом послов.

Несмотря на краткость пребывания А.Лукашенко в Нью-Йорке (предположительно менее суток), кроме встречи с В.Путиным, у него запланировано несколько встреч с коллегами по Движению неприсоединения. С кем конкретно, в белорусском МИД пока не уточняют.

По материалам сайта «Наша свабода»

Сколько стоит виза?

За последние годы Республика Беларусь установила с некоторыми странами безвизовый режим. Например, с Южно-Африканской Республикой. Сохраняются безвизовые поездки белорусских граждан в Турцию, на Кипр и пока в соседнюю Польшу. Однако большая группа стран (Болгария, Румыния, Чехия и др.), в связи с гармонизацией отношений с Европейским Союзом, решили ввести визы для граждан Беларуси.

Для сравнения: в японском посольстве в Беларуси одноразовая виза стоит 10 долларов США, а вот в белорусском посольстве в Токио такая же одноразовая виза стоит 8.600 йен (почти 86 долларов США). Немецкую визу сроком до 30 дней в консульском отделе посольства ФРГ можно купить за 40 немецких марок. Раньше она стоила немного дешевле — 20, а потом 30 марок. Полугодовая немецкая виза стоит 70 марок, а годовая — 100. Зато белорусская виза для немцев стоит уже 100 марок, а многоразовая — 500 марок.

Существенная разница существует и между белорусской и израильской визами. В Минске однократная виза стоит 17 долларов США, а в Тель-Авиве — 265 шекелей (около 66 долларов США).

За однократную Шенгенскую визу, открываемую в Посольстве Франции в Беларуси, надо платить 24 доллара США. За получение белорусской французы должны отдать почти в два раза больше — 300 франков (почти 46 долларов США).

Незначительно отличаются по стоимости однократная белорусская виза в Великобритании и такая же британская виза в Беларуси — 40 фунтов (около 60 долларов США) и 54 доллара США соответственно. В американском посольстве за получение однократной визы надо заплатить 45 долларов за визит к консулу, а многократная обойдется уже в 100 долларов плюс те же 45 за визит к консулу. В белорусском посольстве в Америке наша однократная виза стоит 50 долларов, а многократная — 170 долларов.

Визы в соседние Литву и Латвию стоят столько же, сколько и белорусские визы в этих государствах. 20 долларов в Литве и 15 в Латвии. Кстати, в посольствах Литовской Республики во всех странах мира литовская виза стоит одинаково — 20 долларов.

Канчатковае рашэнне аб няўдзеле ў "восеньскім выбарчым фарсе" прыняла на апошнім паседжанні палітсавета Аб'яднаная грамадзянская партыя. Пасля працяглай дыскусіі толькі трое з дваццаці чатырох сябраў палітсавета выказаліся супраць такой адназначнай рэзалюцыі. На думку старшыні АГП Анатоля Лябедзькі, калі якая-небудзь з партыяў, што ўваходзяць у апазіцыйную кааліцыю, прыме рашэнне ўдзельнічаць у выбарах у палату, то яна мусіць узяць на сябе адказнасць за верагодны развал гэтай самай кааліцыі.

Акрамя пытання выбараў, на палітсавеце была пададзеная ініцыятыва даць Вярхоўнаму Савету 13-га склікання на разгляд Акт Незалежнасці, прыняты на Усебеларускім з'ездзе 29 ліпеня. Гэта, на думку сябраў палітсавета АГП, "надасць гэтаму дакументу сапраўдную юрыдычную сілу".



17 жніўня ў Мінску адбылася ўрачыстая цырымонія провадаў беларускіх спартоўцаў на Алімпіяду ў Сідней. На цырымоніі прысутнічаў А.Лукашэнка, які атрымаў у падарунак "Сертыфікат №1 члена алімпійскай зборнай Беларусі", а таксама спартовую форму. Тым не менш, наколькі нам вядома, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта А.Лукашэнка пакуль не збіраецца ехаць у сонечную Аўстралію, каб самому абараняць колеры Беларусі.

Наша дэмаграфія залежыць ад міграцыі

Сёлета за І паўгоддзе колькасць насельніцтва Беларусі зменшылася на 17,8 тысячы чалавек і склала на 1 ліпеня 10.001.700 чалавек. Такім чынам, з 1994 года, калі колькасць насельніцтва была самай высокай за ўсю агледную гісторыю нашага краю (10.319,4 тысячы чалавек), страты дасягнулі 317,7 тысячы. Гэта непараўнальна меней, чым страты падчас перажытых Беларуссю войнаў, але намнога болей, чым былы Савецкі Саюз згубіў салдатаў за 10 гадоў афганскай вайны.

Можа гэта гульня лёсу, можа вынік нейкага варожага ўздзеяння, але нейкім чынам скарачэнне колькасці насельніцтва пачалося з прыходам да ўлады Лукашэнкі. Спачатку патроху, а потым, як камень з гары пакаціўся... Чаму так? А таму, што беларусы нараджаць дзяцей больш не хочуць: сёлета колькасць памерлых на 24,6 тысячы перавысіла колькасць народжаных. Гэтыя страты нейкім чынам кампенсаваліся за кошт тых, хто прыехаў на жыхарства ў Беларусь. Але людзей, якія жадаюць тут жыць, становіцца ўсё менш. Прыкладам, калі ў першым паўгоддзі мінулага года натуральныя страты насельніцтва на 30,8% былі кампенсаваныя за кошт таго, што да нас на жыхарства прыехалі былыя, у асноўным, грамадзяне савецкіх рэспублік, то сёлета — толькі на 27,9%. А людзі заможныя, з далёкага замежжа, зразумела, да нас не спяшаюцца.

Па-ранейшаму асноўны міграцыйны абмен Беларусі адбываецца з Расіяй, Казахстанам і Украінай. Большасць з гэтых імігрантаў селіцца ў Гомельскай вобласці. У Беларусь прыязджаюць і настолькі абяздоленыя людзі, якія пагаджаюцца па кантракце працаваць замест настолькі ж абяздоленых нашых калгаснікаў. Сезонных працаўнікоў для сельскай гаспадаркі ў асноўным наймаюць калгасы Брэсцкай вобласці: сёлета на дапамогу гаспадаркам В. Далгалёва прыехала 133 чалавекі з Украіны.

Калі колькасць імігрантаў-працаўнікоў, што прыязджаюць у надзеі зарабіць грошы ў Беларусі, скарацілася, то тых, хто імкнецца вырвацца з Бацькаўшчыны нашмат стала больш. Так, колькасць мігрантаў, якія з'ехалі на падставе падпісаных кантрактаў, склала 1.835 чалавек і ў параўнанні з І паўгоддзем 1999 года павялічылася амаль у 2 разы. Большая іх частка (1.243 чалавекі, альбо 67,7%) – гэта моладзь ва ўзросце 24 гадоў, якія маюць стыпендыі ў якасці сваёй асноўнай крыніцы даходаў, інакш кажучы, студэнты. Амаль усе яны заключылі кантракты на выкананне работ, звязаных у большасці з выкарыстаннем фізічнай працы (амаль 96%). Больш за ўсё такіх мігрантау з'ехала ў ЗША. Мо і сапраўды, гэта лепш, чым гінуць ад галечы ў прэзідэнцкай Беларусі?

Па матэрыялах сайта «Наша Свабода»

Як паведамілі ў Рэспубліканскім таварыстве выратавання на водах, за першае паўгоддзе гэтага года ў Беларусі бяды ў воднай стыхіі зазналі 1.584 чалавекі, з іх 351 дзіця. Не ўдалося выратаваць трацізну – 534 небаракі-плыўцы, у тым ліку 43 малыя. Трагічная статыстыка па абласцях такая: Брэсцкая вобласць – 95 тапельцаў, Віцебская – 98, Гомельская – 81, Гродзенская – 63, Мінская – 97, Магілёўская – 53, у Мінску – 47. Калі лідэрства па колькасці смерцяў на вадзе на Віцебшчыне (край азёраў) і Міншчыне (менавіта сюды прыязджаюць купацца сталічныя жыхары, бо мінскія вадаёмы спрэс забруджаныя) традыцыйнае, то Берасцейшчына апынулася на трэцім месцы нечакана.

Тым не менш, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, сёлета ахвяраў меней — відаць, таму што надвор'е халаднейшае. Летась за першыя 6 месяцаў патанулі 843 чалавекі. Тады толькі ў чэрвені былі зафіксаваныя 542 трагічныя выпадкі.

Асноўная прычына смяротных здарэнняў на вадзе – баўленне часу ў забароненых для купання месцах. Нездарма на рэках і азёрах, дзе ёсць спецыяльныя выратавальныя станцыі (усяго іх па краіне 61), сёлета загінулі толькі 2 чалавекі. Прычым нават там купацца бяспечней за ўсё з 9 да 21 гадзіны. Менавіта гэтай парой сутак выратавальнікі, мяняючыся праз кожныя дзве гадзіны, наглядаюць за воднай акваторыяй.

Другая прычына, чаму людзі патанаюць, — злоўжыванне алкаголем. П'яным ў вадзе гіне 60% тапельцаў.

Люди и манекены

Опыт экстрасенсорной публицистики

Александр ДУБРАВИН

Меня пригласили на беседу за "круглым столом" по теме "Общественно-политическая ситуация накануне выборов". Стол в маленьком зале оказался и в самом деле круглым, а также большим, темным, лаковым, широким, красивым и засыпанным белыми бумагами. С огромной дырой посередине. Стол осеняло висевшее с легким наклоном красно-зеленое полотнище, формой напоминавшее раструб огнетушителя. Под раструбом сидели люди и манекены. Люди виднелись разные (полные, худые, молодые и не очень), но они выглядели независимо, сами по себе. Манекены же были все на одно лицо и держались корпоративно, как спички в коробке.

Среди людей я увидел знакомых журналистов из независимых изданий и вольных стрелков из окрестных информационных угодий. А среди манекенов мною была замечена пара твердоголовых портновских кукол, обглоданных со всех сторон, словно крысами, коммунистическими догмами; одна ветхая полевая стрелковая мишень в полный рост, с пулевыми пробоинами в области головы; несколько муляжей из газет и серой ваты, обтянутых рваным коленкором редакционных диванов; деревянное приспособление, сделанное из остатков шлагбаума, под артикулом "Робот депутатский №2 с педалью", мягкая фигура из тряпичных лоскутков и желтое восковое учебное тело с резиновыми присосками вместо рук.

Люди и манекены создавали шум. Люди в чем-то энергично убеждали друг друга, запинаясь, ошибаясь, повторяясь и волнуясь, а манекены равнодушно резонировали, механически модулировали банальные словесные формулы ("Выборы – это важно", "Люди ждут выборов", "Демократия – это народовластие", "Выборам нет альтернативы" и т.д.), задумчиво глядя на окружающих своими оловянными глазами-пуговицами.

Иерархически и конструктивно массив манекенов замыкался на фигуре кентавра в виде туловища человека в блестящих полковничьих погонах, совмещенного с безжизненным государственным стулом, который, в свою очередь, был соединен грибницей с манекенами, с другими аналогичными стульями, в других кабинетах, вокруг других столов различной конфигурации. Верхняя часть кентавра слегка сутулилась, топорщила седые волосы и улыбалась розовым лицом, словно ее веселили синхронные движения и артикуляция механических кукол, обычно таких беспомощных, безжизненных и бессильных. Из-за воротника мундира куда-то вверх тянулся багровый жгут пуповины, связывающий его с той Говорящей Головой, которая каждый вечер материализуется в темных углах наших квартир и становится для наших детей такой же привычной, как цветочный горшок, и которая всегда со знанием дела объясняет дуракам, как надо сеять, жать, оплодотворять, поднимать со дна моря атомные подлодки, вывозить навоз и усмирять агрессоров.



Я прислушался. Чу! Люди спорили о выборах. Они говорили о том, что предательство неких непорядочных субъектов, долгое время выдававших себя за людей, но подспудно взлелеявших в душе черную жабу неудовлетворенного самолюбия и жадности, перекинувшихся мумиями и зомби, поставило под угрозу единство всего человечества в нашей стране накануне позорных выборов в свиту Говорящей Головы. Что это чревато поражением людей в битве с манекенами. За словами людей стояло ясное понимание того, что это грозит гибелью всей нашей юной и прекрасной стране. Что в результате их игрищ она может безвозвратно сползти туда, за край света, где кончается твердыня Вселенной, стоящая на трех китах, и где плещутся маслянистые воды небытия, в которых вечно стонут и мечутся души нехристей, монархистов, шовинистов, большевиков и грешников.

Люди говорили об этом и страдали. Их страдания испарялись и конденсировались на потолке. Манекены глупо улыбались. Кентавр содрогался от пароксизмов наслаждения, передавая сигналы по грибнице. Затем он сам сказал что-то в том смысле, что люди принесли ему очень мало информации. Что он не затем их позвал, чтобы следить за их чувствами. На некоторое время в зале повисла тишина.

Внезапно заверещала о чем-то стрелковая мишень и так же внезапно умолкла. Затем вдруг заговорили редакционные муляжи, и я не могу сейчас вспомнить ни одного их отдельного слова. Но речь, безусловно, шла о выборах. Несчастные, они не могли постичь сути вещей, уловить движения планет и светил, и,возможно, говорили только потому, что иначе оказались бы на свалке, среди фикусов и дырявых кастрюль.

Довольно! Наблюдатели на цыпочках потянулись из зала. На свежий воздух! В поля! В луга! В леса! В пампасы! Но что это?

— Вероятно, я единственный из присутствующих здесь, кто выдвинул свою кандидатуру на выборы в свиту Говорящей Головы, — заговорил внезапно мягким голосом один из журналистов, полненький и кругленький. — Но мне совершенно не стыдно и абсолютно не совестно мне.

— Нет-нет, — закричал какой-то муляж. — Ты не одинок. Мы тоже...

— Я каждый день таскаюсь по чужим квартирам, как старая сводница, как висельник в поисках веревки. Я пресмыкаюсь, я прошу всех подписывать мои мятые бумажки в поддержку меня, я агитирую за выборы меня туда, но я совершенно не в курсе. — На спину полненького журналиста, царапая когтями рубашку, забралась огромная лиловая ящерица и обвилась вокруг шеи, наподобие воротника. Лицо его побагровело. — Но я совершенно не в курсе, знает ли меня народ?

Вдруг послышался скрежет, скрип шарниров и удары дерева о дерево. На стол настойчиво карабкалось устройство "Робот депутатский №2 с педалью", сделанное из шлагбаума.

— Я, от имени и по поручению всех моих избирателей, всех тружеников района, по которому я выдвигаюсь...



Бюлетэнь «Грамадзянскі форум».
Заснавальнік:
АРМА «Грамадзянскі форум».

Выдаецца на беларускай і рускай мове. Перыядычнасць 2 разы ў месяц.
Распаўсюджваецца бясплатна на правах унутранай дакументацыі. Выдадзена накладам 299 асобнікаў.
Выдадзена пры дабрачыннай падтрымцы Гарадзенскага абласнога грамадскага аб'яднання "Ратуша", Фонда "Альянс Каунтэрпарт", Камісіі па Дэмакратыі Амбасады ЗША на Беларусі і Нацыянальнага Фонду на карысць дэмакратыі (ЗША).
Адрас для пошты: 231100, Ашмяны-3, а/я 63. E-mail: Civil_Forum@mailru.com